2. Национальный исторический архив Беларуси (далее НИАБ) в Минске.— Фонд 694.— Оп. 3.— Д. 166.
3. Федорук А.Т. Садово-парковое искусство Белоруссии.— Мн.: Ураджай, 1989.— 248 с.
4. Государственный исторический архив Литвы (далее ГИАЛ).— Фонд 459.— Оп. 1.— Д. 2592.
5. Aftanazy Roman. Dzieje rezydencij na dawnych kresach Rzeczypospolitej: W 11 T.— T. 1.— 1991.— 260 s.
6. ГИАЛ.— Фонд 1280.— Оп. 1.— Д. 288.
7. Там же.— Фонд 459.— Оп. 1.— Д. 2584.
8. НИАБ в Минске.— Фонд 694.— Оп. 2.— Д. 5584.
9. Там же.— Д. 5680.
10. Там же.— Оп. 3.— Д. 1193.
11. Там же.— Д. 5000.
12. Там же.— Оп. 3.— Д. 2994.


УДК 061.236.64 (476) «1944-1985»

# ПРАТЭСТАНЦКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ БССР У 1944-1985 ГГ.: СТРУКТУРА, ФОРМЫ ДЗЕЙНАСЦІ, УЗАЕМААДНОСІНЫ З ДЗЯРЖАВАЙ (АСНОЎНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ)

***Н.Г. Балтрушэвіч***

***УА «ВДМУ» , г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь***

Гістарычнай традыцыяй беларускага грамадства з'яўляецца шматканфесіянальнасць. Са старажытных часоў вялікае значэнне набыло праваслаўе. Аказаўшы рашаючы уплыў на ўсе сферы жыцця народа, яно і сёння карыстаецца велізарным аўтарытэтам у грамадстве, застаецца рэлігіяй большасці беларусаў. На працягу стагоддзяў рымска-каталіцкая царква рабіла уплыў на значную частку насельніцтва. садзейнічала фарміраванню агульначалавечага светаўспрымання і светапогляду. З XVI стагоддзя на беларускіх землях з'яўляюцца пратэстанты. Пратэстанцкая канфесія ў значнай ступені паўплывала на фарміраванне самабытнасці беларускай культуры, садзейнічала ўстанаўленню традыцый верацярпімасці народа. Узаемадзейнічаючы паміж сабой, праваслаўныя, каталікі, пратэстанты, мусульмане, іудзеі фарміруюць у грамадстве рэлігійную талерантнасць, якая працягваецца і па сённяшні дзень.

За постсавецкія гады айчынная гістарычная навука зрабіла нямала крокаў па пераадоленні негатыўных адносін да рэлігійнага светапогляду ў савецкай канфесіянальнай гісторыі. Нягледзячы на распрацоўку складанай праблемы, многія яе аспекты застаюцца нявывучанымі. Адным з такіх аспектаў з'яўляецца гісторыя пратэстанцкіх арганізацый.

Пратэстантызм (ад лац. protestans "нязгодны, які пярэчыць") – адзін з асноўных накірункаў хрысціянства. Узнік ў перыяд Рэфармацыі ў Еўропе і ўяўляе сабой сукупнасць самастойных рэлігійных плыней са сваімі догмамі і асаблівасцямі [1, с. 568]. На Беларусі па ініцыятыве студэнтаў, што навучаліся ў Еўропе у другой палове XVI ст., пачалі ствараца першыя лютэранскія абшчыны [2, с. 120]). Пазней, у XIX-XX ст., з'явіліся баптысты, евангельскія хрысціяне, адвентысты, сведкі Іеговы і інш. Сёння пратэстанцкія накірункі развіваюцца ў нашай краіне даволі хутка. За апошняе дзесяцігоддзе колькасць пратэстанцкіх абшчын павялічылася ў 3,5 раза, у той час як праваслаўных – у 2,5, каталіцкіх – у 2 [3, с. 10]. З'явіліся і новыя для Беларусі пратэстанцкія аб'яднанні – Новаапостальская царква, хрысціяне поўнага евангелля, Царква Ісуса Хрыста Святых Апошніх Дней і іншыя. Усяго ў краіне налічваецца 14 пратэстанцкіх накірункаў. Найбольш шматлікімі сярод іх з'яўляюцца хрысціяне веры евангельскай (ХВЕ), евангельскія хрысціяне баптысты (ЕХБ), хрысціяне поўнага евангелля (ХПЕ), адвентысты сёмага дня [4, с. 312-313; 5, с. 62; 6, с. 5].

Мадэрнізацыя дагматыкі, культу і абраднасці дазваляе пратэстантызму адаптавацца да грамадскіх працэсаў. У масавай свядомасці яго накірункі нярэдка характарызуюцца як дэструктыўныя, іх веравучэнне – непажаданая для Беларусі форма духоўнасці. У некаторай ступені гэта абумоўлена арганізацыйнай раздробленасцю пратэстантызму і неадназначным тлумачэннем хрысціянскіх дагматаў. Тым не менш, пратэстанцкія каштоўнасці арганічна ўваходзяць у жыццё грамадства, іх абшчыны больш памяркоўна прыстасоўваюцца да сучасных сацыякультурных і сацыяльна-эканамічных умоў, асаблівасцяў паўсядзённага жыцця людзей [7, с. 765]. Пратэстанты шмат увагі надзяляюць індывідуальнай рабоце з моладдзю, выкарыстоўваючы такія формы, як нядзельныя

школы, правядзенне маладзёжных канферэнцый, семінараў, фестываляў духоўнай музыкі, летніх лагераў адпачынку і інш. У гэтым яны апярэджваюць традыцыйныя хрысціянскія канфесіі. Такім чынам, сёння колькасць пратэстантаў значная ўзрасла, яны актыўна ўдзельнічаюць ва ўсіх сферах жыцця Беларусі.

Падобнай дынамікі развіцця пратэстантызму не назіралася на працягу 1944-1985 гг. Складанасцю і супярэчлівасцю характарызуецца гісторыя пратэстанцкіх арганізацый у БССР у акрэслены перыяд.

1. Савецкая дзяржаўна-канфесіянальная палітыка на розных этапах разглядаемага перыяду мела свае асаблівасці ў адпаведнасці са зменай поглядаў кіраўніцтва ВКП(б)/КПСС на рэлігійнае пытанне. Яна ажыццяўлялася праз цеснае ўзаемадзеянне партыйных, савецкіх структур і органаў дзяржаўнай бяспекі.

Нягледзячы на тое, што ў цэлым дзяржаўна-канфесіянальная палітыка была накіравана на выцясненне рэлігіі з духоўнай сферы жыцця чалавека і ўплыву на грамадства, у яе развіцці можна вылучыць тры этапы, кожны з якіх меў свае асаблівасці і спецыфіку:

1944 – 1953 гг. – гэты этап характарызаваўся пэўнай лібералізацыяй дзяржаўна-канфесіянальнай палітыкі, што абумовіла колькасны рост пратэстанцкіх арганізацый, стварэнне саюзнай цэнтралізаванай структуры (УСЕХБ);

1954 – 1964 гг. – перыяд жорсткай канфрантацыі дзяржавы з пратэстанцкімі арганізацыямі, ганенняў і рэпрэсій супраць пратэстантаў, што правакавала хістанні і разлад унутры адзінага арганізацыйнага арганізма і прывяло да расколу Саюза ЕХБ;

1965 – 1985 гг. – параўнальнае паляпшэнне становішча пратэстанцкіх арганізацый пры вонкава лаяльным заканаўстве, дастаткова пільным кантролі за іх дзейнасцю.

Дзяржаўная палітыка ў адносінах да пратэстанцкіх арганізацый на ўсіх этапах насіла дыферэнцыраваны характар, што было выклікана існаваннем розных накірункаў пратэстантызму, у тым ліку і канфрантацыйна настроеных у адносінах да дзяржавы (пяцідзесятнікі, адвентысты, прыхільнікі РЦЕХБ). Асноўнымі метадамі ажыццяўлення дзяржаўна-рэлігійнай палітыкі з'яўляліся: атэістычная прапаганда, меры адміністрацыйна-крымінальнага ўздзеяння (зняцце з рэгістрацыі абшчын, закрыццё малітоўных будынкаў, забарона рэгістраваць новыя рэлігійныя аб'яднанні, прыцягненне кіраўнікоў і найбольш актыўных вернікаў да адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці, перaслед дзяцей вернікаў падчас вучобы, звальненне пратэстантаў з работы), ідэалагічная работа сярод насельніцтва. Эфектыўнасць гэтай работы забяспечвалася адпаведным заканадаўствам у галіне рэлігіі, стварэннем кантралюючых дзяржаўных структур у выглядзе Савета па справах Рускай праваслаўнай царквы і Савета па справах рэлігійных культаў, сістэмы іх упаўнаважаных на месцах. Разам з тым, тэндэнцыя росту пратэстанцкіх арганізацый і іх прыхільнікаў сведчыць пра тое, што дзяржаўна-рэлігійная палітыка, што ставіла сваёй мэтай зніжэнне рэлігійнага ўплыву, жадаемых вынікаў не прынесла.

2. Пратэстанцкія арганізацыі БССР не мелі адзінай незалежнай рэспубліканскай структуры. Яны ўваходзілі ў саюзную структуру – Усесаюзны саюз евангельскіх хрысціян-баптыстаў (УСЕХБ) з цэнтрам у Маскве, створаным у 1944 г. пад ідэалагічна-адміністрацыйным націскам. УСЕХБ, у які ўвайшлі ЕХБ і ХВЕ, прадстаўнікі розных па дагматычных прынцыпах, асаблівасцях богаслужэння накірункаў пратэстантызму, фармальна захоўваўся на працягу ўсяго разглядаемага перыяду. Але ў пачатку 1960 г. нарастанне супярэчнасцей унутры Саюза, узмацненне канфрантацыйных адносін з уладамі радыкальнай часткі пратэстанцкіх арганізацый прывяло да яго расколу і вылучэння часткі арганізацый у новую структуру пад кіраўніцтвам Рады цэркваў ЕХБ. Гэтая структура не была прызнаная партыйна-дзяржаўнымі органамі, дзейнічала ў падполлі, а яе прыхільнікі пастаянна падвяргаліся пераследу. Падобныя тэндэнцыі мелі месца і на тэрыторыі БССР. Цэнтрам РЦЕХБ з'яўлялася Брэсцкая вобласць, у першую чаргу г. Брэст. Для беларускіх кіраўнікоў Саюза ЕХБ у гэты час было характэрна імкненне ўсімі магчымымі сродкамі захаваць існуючыя арганізацыі і пераадолець раскол. У пачатку 1980-х гг. некаторыя абшчыны перaгледзелі свае пазіцыі і пачалі рэгістравацца аўтаномна, не заяўляючы аб сваёй прыналежнасці да таго ці іншага Саюза ЕХБ.

Распаўсюджванне пратэстантызму і рост пратэстанцкіх арганізацый ў БССР адбываліся нераўнамерна па ўсёй яе тэрыторыі. Цэнтрам пратэстантызму на працягу ўсяго перыяду з'яўлялася Брэсцкая вобласць. Суб'ектыўна гэтаму садзейнічала адміністрацыйна-тэрытарыяльная рэформа, паводле якой да Брэсцкай вобласці былі далучаны раёны скасаваных Пінскай і Баранавіцкай абласцей, у якіх таксама канцэнтравалася значная колькасць пратэстанцкіх арганізацый. У гэтым рэгіёне назіралася і канцэнтрацыя незарэгістраваных арганізацый. Разам з тым, з другой паловы 1960-

х гг. назіраецца значны рост пратэстанцкіх абшчын і ў іншых абласцях БССР – Мінскай (у тым ліку і ў г. Мінску) і Магілёўскай.

3. У дзейнасці пратэстанцкіх арганізацый БССР вылучаюцца два асноўныя напрамкі: рэлігійна-місіянерскі і грамадска-прававы. Яны пастаянна зменьваліся пад уплывам знешніх і ўнутраных фактараў, прадугледжвалі выкарыстанне як дазволеных форм і метадаў дзейнасці (адпраўленне богаслужэнняў у зарэгістраваных арганізацыях, арганізаваныя хоры і аркестры, пэўныя абрадавыя цырымоніі, зварот вернікаў са скаргамі ў дзяржаўныя структуры і інш.), так і не дазволеных (мэтанакіраваная індывідуальная работа, масавая прапаведніцкая дзейнасць у малітоўных дамах і па-за яе межамі; нядзельныя школы, юнацкія і падлеткавыя гурткі,; сямейнае выхаванне; матэрыяльная і маральная падтрымка пратэстанцкіх сем'яў). Назіраліся таксама праяўленні нелаяльнага стаўлення да ўладаў – арганізацыя нелегальных тыпаграфій, праваабарончых арганізацый, выступленні аб спыненні ганенняў і рэпрэсій супраць вернікаў-пратэстантаў, актыўнае хадайніцтва аб дазволе на выезд з СССР. Значную ролю ў захаванні пратэстанцкіх арганізацый адыгрывала сям'я, дзе з пакалення ў пакаленне ўкараняліся асаблівасці пратэстанцкага веравучэння. Паміж легальнай і нелегальнай дзейнасцю пратэстанцкіх арганізацый незаўсёды можна вызначыць дакладную мяжу.

4. Нягледзячы на адносную нешматлікасць вернікаў, пратэстанцкія арганізацыі БССР здолелі захаваць тэндэнцыю павелічэння сваіх прыхільнікаў. Усяго за 1944 – 1985 гг. у БССР колькасць зарэгістраваных абшчын ЕХБ узрасла на 23,7%, вернікаў – на 82,6%. Функцыянавала значная колькасць незарэгістраваных суполак.

Адбыліся змены і ў сацыяльным, полава-узроставым і адукацыйным складзе вернікаў. У першыя пасляваенныя гады ў пратэстанцкіх арганізацыях пераважную большасць мелі жанчыны-калгасніцы і хатнія гаспадыні ва ўзросце ад 50 гадоў і больш (70 – 75%) з нізкім узроўнем адукацыі. Гэта было абумоўлена канцэнтрацыяй асноўнай масы пратэстантаў у сельскай мясцовасці.

Урбанізацыйныя працэсы, пашпартарызацыя вяскоўцаў, якая дазволіла ад'езд у гарады, змянілі структуру пратэстанцкіх арганізацый. Хоць і надалей у пратэстанцкіх арганізацыях значнай заставалася колькасць пенсіянераў і хатніх гаспадынь, набыла ўстойлівасць тэндэнцыя росту сярод вернікаў адукаванай моладзі. З 1976 па 1985 гг. у БССР удзельная вага моладзі ў гарадскіх арганізацыях ЕХБ павялічылася на 7,1%, пяцідзесятнікаў – на 12,6%, АСД – на 10,6%. У сельскіх арганізацыях АСД павелічэнне моладзі склала 0,6%, ЕХБ – 3,5%, пяцідзесятнікаў – 4,9%. Змяніўся і адукацыйны ўзровень членаў пратэстанцкіх арганізацый: на пачатак 1985 г. вернікі з пачатковай адукацыяй складалі 26%, васьмігадовай – 31%, сярэдняй – 38%, вышэйшай – 1,6%.

У сацыяльнай структуры пратэстанцкіх арганізацый узрасла колькасць рабочых і служачых, змяніліся суадносіны мужчын і жанчын у бок павелічэння ўдзельнай вагі мужчын. Калі ў першай палове 1950-х гг. жанчыны складалі да 90% вернікаў, то ў першай палове 1980-х гг. іх колькасць у абшчынах Віцебскай вобласці склала ад 72% да 80%, Брэсцкай – ад 53% да 63,5%.

Павышэнне адукацыйнага ўзроўню паствы, прыток моладзі стварылі ўмовы для далейшага захавання і развіцця пратэстанцкіх арганізацый.

Сёння кожнаму грамадзяніну Рэспублікі Беларусь прадастаўлена права спавядаць любую рэлігію альбо быць атэістам. Грамадства зацікаўлена ў дыялогу прадстаўнікоў розных канфесій, усталяванні прынцыпаў талерантнасці і супрацоўніцтва. Паважлівыя ўзаемаадносіны з'яўляюцца гарантам сацыяльнага міру і спакою на беларускай зямлі [8, с.335]. Але для таго, каб працягваць дабратворны дыялог паміж дзяржавай і царквой, пазбегнуць шматлікіх памылак і перагібаў, неабходна глыбока і дасканала вывучаць канфесіянальную гісторыю на розных этапах яе развіцця. Толькі ўлічыўшы вопыт мінулага, магчыма пабудаваць сапраўднае дэмакратычнае грамадства.

Спіс скарыстаных крыніц:


1. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд) [і інш ]. – Мінск: БелЭн, 1993-2003 . – Т.5. М – Пуд / Г.П. Пашкоў [і інш ]. – 1999. – 592 с.
2. Круглов, А.А. Развитие атеизма в Белоруссии (1917-1987 гг.) / А.А. Круглов. – Минск: «Беларусь», 1989. – 365 с.
3. Данилов, А.В. Особенности конфессиональной структуры РБ / А.В. Данилов, В.А. Мартинович // Посткоммунистическая Беларусь в процессе религиозных трансформаций: сб. ст.; под. ред. А.В.Данилова. – Минск: Адукацыя и выхаванне, 2002. – С. 6-13.
4. Цвилик, М.В. Современная конфессиональная жизнь в Беларуси / М.В. Цвилик // Вопросы свободы совести и религиозных организаций в Республике Беларусь: сборник документов и материалов / Комитет по делам религий и национальностей при Совете Министров РБ / авт.-

сост. М.В. Цвилик, под науч. ред. В.И. Новицкого. – Минск: Издательство «Четыре четверти», 2005. – С. 308-324

5. Пастухов, Е.В. Современное состояние пятидесятнического движения в Республике Беларусь. (Союз христиан веры евангельской) / Е.В. Пастухов // Посткоммунистическая Беларусь в процессе религиозных трансформаций: Сб.ст ; под. ред. А.В. Данилова. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2002. – С. 62-69.
6. Докладные записки, справки уполномоченного Совета по делам религий при Совмине СССР по БССР, инспекторов, областных уполномоченных Совета по делам религий о состоянии религиозности в республике. Том 2. // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд. 136. – Воп. 1. – Спр. 76.
7. Современная Беларусь: энциклопедический справочник: в 3 т. / редкол.: М.В. Мясникович [и др]. – Минск: Белорус. Наука, 2007. – Т.3: Культура и искусство / М.В. Мясникович [и др]. – 2007. – 778 с.
8. Канфесіі на Беларусі ( к. 18-20 ст.) / В. В. Грыгор’ева [і інш.]; пад навук. рэд. У. І. Навіцкага. – Мінск: ВП “Экаперспектыва”, 1998. – 340 с.

УДК 338.24

## ИСТОРИЧЕСКИЕ АСПЕКТЫ ЭКОНОМИЧЕСКОГО АНТРОПОЦЕНТРИЗМА

***В.К. Егорова***

***УО «ВГТУ», г. Витебск, Республика Беларусь***

Эволюция экономических эпох от доиндустриальной, через индустриальную к постиндустриальной в первую очередь затронула трансформацию взаимоотношений труда и капитала. Как известно, дух индустриальной эпохи выражает философия техноцентризма, в которой ставка делалась на новую технологию, а рабочая сила рассматривалась только как элемент издержек производства. На практике это выразилось в ориентации на обновление оборудования и продукции при сохранении традиционной организации труда, в стремлении использовать новую технологию для усиления контроля над рабочей силой, а зачастую ее сокращения в попытках создать полностью автоматизированные производства. Для техноцентризма характерны принудительный ритм труда, жесткий режим рабочего времени, централизованное в рамках фирмы и авторитарное управление производством и трудом, функционирование работников производственного конвейера лишь в качестве составных элементов технологического процесса при отстранении их от принятия организационно-технических и производственно-экономических решений. Возникнув на основе массового производства, техноцентризм превратился на протяжении 20-60 годов прошлого столетия в подлинную философию индустриализма..Ему присуща и определенная социальная модель взаимоотношений труда и капитала, для которой характерно, во-первых, ограничение возможностей применения индивидуальных способностей работников в производстве, односторонность развития работника – развитие тех свойств, которые нужны производству; во-вторых, компенсирование подчиненности работника технологическому процессу большей заработной платой, льготами, привилегиями со стороны фирмы. Доминирующая тенденция техноцентризма – превращение человека в придаток машинной системы, прочное соединение авторитарного управления с конвейерной технологией.

В 80-е годы мировая экономика оказалась втянутой в новый этап технологических преобразований, для которого характерна непрерывность инновационного процесса, комплексность нововведений, охватывающих все основные элементы производительных сил. Получила признание точка зрения, что решающей предпосылкой конкурентоспособности является высококвалифицированная, постоянно обучаемая, ответственная рабочая сила, заинтересованная в высоких результатах производства, обеспеченная устойчивой занятостью. Внедряется антропоцентрическая система производства, при которой сливаются воедино преобразования в технологии, организации производства и системе подготовки (переподготовки) кадров. Антропоцентризм представляет собой новую философию постиндустриализма, главное в которой – демократизация производства и организации труда на основе все большего вовлечения трудового коллектива в принятие решений, интеграции интересов коллектива и предприятия. В достижении конкурентоспособности делается ставка на мобилизацию социальной активности работников, на